

Адам Глобус, Уладзімір Сцяпан

# ДЗІКАЕ ПАЛЯВАННЕ

Мінск
«Юнацтва»
1991

## Легенда ў малюнках паводле аповесці У. Караткевіча



1. Цёмныя хмары прыгнёту плылі па-над Беларуссю.



2. Народ паўстаў — бунтавалі хлопы і беларуская шляхта.



3. Паўстанцы абралі каралём Стаха Горскага.



4. Паўстанцы ўзялі прысягу каралю.



5. Войска Стаха пайшло на замак.



6. Быў цяжкі бой.



7. Замак здаўся.



8. Толькі Раман Яноўскі не радаваўся перамозе.



9. Кароль Стах сказаў:
— Калі ты, Раман, уступіў у змову з ворагам, сцеражыся!



10. Раман пакляўся ў вернасці каралю і запрасіў Стаха на паляванне.



11. Кароль прыехаў.



12. Раман прыбраў свой палац агнямі.



13. Ён сустрэў караля на парозе.



14. Госці доўга балявалі.



15. Казалі тосты ў гонар караля.



16. Весяліліся цэлы дзень.



17. А ноччу паехалі на паляванне.



18. Палявалі на людажэра — балотнага лемпарда.



19. На балоце свяціліся прывідныя агні.



20. Раман Яноўскі быў з хаўруснікамі — Дубатоўкам і Варонай.



21. Загоншчыкі трубілі ў рогі.



22. Кароль Стах і Яноўскі адбіліся ад загоншчыкаў.



23. З-за купіны скочыў лемпард балотны...



24. Людажэр!



25. Лемпард напаў на Рамана.



26. Кароль Стах забіў людажэра.



27. Сабралася паляванне.



28. Усе віншавалі караля Стаха.



29. Паляўнічыя расклалі вогнішча і пачалі баляваць.



30. Смажылі дзічыну.



31. Раман неўпрыкмет насыпаў у віно атруты.



32. Толькі кароль Стах не піў віна.



33. Раман чакаў, пакуль засне паляванне.



34. Калі паляванне заснула, Раман дастаў меч.



35. У цемры блішчала лязо.



36. Поўня закацілася за хмару.



37. Здраднік ударыў караля Стаха ў спіну.



38. І сказаў кароль Стах перад смерцю:
— Прадаў ты свой край! Забіў караля! Але я не памру, я прыйду да цябе і да дзяцей тваіх, каб адпомсціць. Чакай і бойся!



39. Прачнуліся людзі Стаха і схапіліся за нажы.



40. Распачаўся бой.



41. Гінулі людзі Стаха...



42. ...пад яснай поўняй.



43. Яноўскі, Дубатоўк і Варона перамаглі.



44. Яны прывязалі да коней мёртвых вояў.



45. Засвісталі бізуны.



46. Коні памчалі да прорвы.



47. У каралю Стаху была яшчэ іскра жыцця.



48. У цемры ляцеў ягоны голас:
— Мы прыйдзем! Ты прадаў Беларусь! Мы вернемся і адпомсцім.



49. Народнае войска засталося без караля.



50. Гетман узрадаваўся смерці караля Стаха.



51. Гетман сабраў магутныя палкі.



52. Народнае войска выйшла на бой з гетманаўскімі палкамі.



53. Доўга цягнуўся бой.



54. Гетман перамог.



55. Загінула народнае войска.



56. Жанчыны галасілі над забітымі.



57. А Раман Яноўскі радаваўся і піў віно.



58. Мінуў год. Варона першы пабачыў Стахаў цень...



59. ...і звар'яцеў.



60. Чутка пра паляванне караля Стаха абляцела Беларусь.



61. Дубатоўк другі пабачыў Стахаў цень.



62. Дубатоўк уцякаў, але трапіў у багну і загінуў.



63. Аднойчы Раман Яноўскі вяртаўся ў свой палац.



64. Была зорная ноч.



65. На далягладзе з'явіліся коннікі.



66. Раман пачуў паляўнічы рог.



67. Коннікі набліжаліся.



68. Раман пачаў уцякаць.



69.— Дзікае паляванне караля Стаха! — закрычаў Раман.



70. Коннікі нагналі здрадніка, Рамана Яноўскага, і ў таго разарвалася сэрца.



71. Па верасе, па гіблай дрыгве скача дзікае паляванне караля Стаха...


Малюнкі аўтараў

*Для дзяцей малодшага школьнага ўзросту*

**ГЛОБУС Адам (АДАМЧИК Владимир Вячеславович),**
**СТЕПАН Владимир (СТЕПАНЕНКО Владимир Александрович)**

**ДИКАЯ ОХОТА**

**Легенда в рисунках по мотивам повести**
**В. Короткевича**

Минск, издательство «Юнацтва»

На белорусском языке

**ГЛОБУС Адам (АДАМЧЫК Уладзімір Вячаслававіч),**
**СЦЯПАН Уладзімір (СЦЕПАНЕНКА Уладзімір Аляксандравіч)**

**ДЗІКАЕ ПАЛЯВАННЕ**

**Легенда ў малюнках паводле аповесці**
**У. Караткевіча**

Загадчык рэдакцыі А. П. Чаркасаў. Рэдактар Н. В. Філіповіч. Малодшы рэдактар А. С. Леус. Мастацкі рэдактар У. М. Жук. Тэхнічны рэдактар С. А. Абрамчук. Карэктар Л. С. Мануленка.

ІБ № 1347

Здадзена ў набор 04.05.89. Падпісана да друку 23.10.89. Фармат $60\times90^1/_8$. Папера афс. № 1. Гарнітура Школьная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 2,0. Ум. фарб.-адб. 9,0. Ул.-выд. арк. 1,73. Тыраж 250 000 экз. Зак. 140. Цана 20 к.
Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага камітэта БССР па друку. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінская фабрыка каляровага друку. 220115, Мінск, Каржанеўская, 20.
Дыяпазітывы тэксту падрыхтаваны Мінскім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінатам МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

**Г $\frac{4803120201-025}{М\ 307(03)-91}$ 17—90**

**ББК 84 Бел 7**
**Г 54**

**ISBN 5-7880-0319-9**



© Выдавецтва «Юнацтва», 1991

20 к.



«Юнацтва»